благодаря чему повышается мотивация к изучению немецкого языка и дети достигают высоких результатов в обучении.


### Литература

1. Коломенский, Я. Л. Учителю о психологии детей шестилетнего возраста : книга для учителя / Я. Л. Коломенский, Е. А. Панько. – М. : Просвещение, 1998. – 190 с.
2. Лесгафт, П. Ф. Педагогика : избранные труды / П. Ф. Лесгафт. – М. : Юрайт, 2017. – 375 с.
3. Немецкие игры для детей подвижные // О ребенках [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://orebenkah.ru/igry-dlja-detej/nemeckie-igry-dlja-detej-podvizhnye.html. – Дата доступа: 10.02.2019.
4. Пралеска: учебная программам дошкольного образования. – Минск : НИО, 2012. – 416 с.
5. Delitz, G. 100 schnelle Spiele für Deutsch als Zweitsprache / G. Delitz, P. Proßowsky. – Augsburg : Aura, 2017. – 150 S.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Роля электронных энцыклапедый у сучасных адукацыйных працэсах


*А. А. Дзеручэнка*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – К. В. Крывіцкая, выкладчык кафедры замежных моў*



**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца роля электроннай энцыклапедыі ў адукацыйных працэсах, у распаўсюжванні беларускай мовы ў інтэрнэт-прасторы.



**Ключавыя словы:** беларуская мова; энцыклапедыя; інтэрнэт; Вікіпедыя.


Мова, падобна Сусвету, неабдымна вялікая, знаходзіцца ў дынаміцы. Абавязковым этапам на шляху да навуковага вывучэння мовы і навучання мове становіцца яе сістэматызацыя. Фарміраванне сучаснай беларускай літаратурнай мовы і яе сістэматызацыя пачаліся параўнальна нядаўна.

Мова – з’ява рухомая, таму мы пастаянна сутыкаемся з новымі словамі. Новым этапам развіцця беларускай мовы стаў 1969 год – выходзяць першыя тамы найбуйнейшай на той момант Беларускай Савецкай Энцыклапедыі [1]. За 6 гадоў было выдадзена 12 тамоў. Але, як ужо было сказана, мова не стаіць на месцы, яе

слоўнікавы склад няспынна пашыраецца – таму праз 21 год выходзіць 18-томная ўніверсальная Беларуская Энцыклапедыя, якая змяшчае ў сабе больш за 80 тысяч тэрмінаў. Як над першай, так і над другой энцыклапедыямі працавалі выбітныя беларускія навукоўцы, напрыклад, аўтарамі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі стала больш за 5 тысяч вучоных [1].

У час інфармацыйных тэхналогій і папулярызацыі інтэрнэту моўныя і культурныя межы сціраюцца. Такія словы, як інтэрнэт, месэнджар, смартфон, электробус і інш., наўрад ці існавалі або былі ў актыўным ужытку 50 гадоў таму. Праблема вялікага прытоку ў мову новых замежных слоў не новая, але надзвычай актуальная. Папяровыя носьбіты не могуць адужаць такую вялікую плынь новых тэрмінаў і слоў: навукоўцы не паспяваюць аператыўна стварыць энцыклапедыю, у якой будзе дадзены адказ на любое пытанне. Праблема патрабуе кардынальных рашэнняў.

6 красавіка 2004 года адбылася не менш значная падзея, чым выданне першай беларускай энцыклапедыі: у гэты дзень была запушчана беларускамоўная Вікіпедыя – электронная інтэрнэт-энцыклапедыя [2].

У наш час многія чулі пра гэты электронны рэсурс. Ёсць тыя, хто яго крытыкуе, ёсць тыя, хто актыўна карыстаецца. Але нельга адмаўляць таго, што Вікіпедыя з'яўляецца ўнікальным праектам, у першую чаргу адукацыйным. Беларуская мова займае асаблівае месца ў дадзеным праекце: на ёй напісана больш за 165 000 артыкулаў [2], агульны аб'ём якіх складае 3600 выдавецкіх аркушаў, што адпавядае 36 тамам універсальнай энцыклапедыі. У 2019 годзе Беларуская Вікіпедыя па колькасці артыкулаў увайшла ў дзясятку найбуйнейшых сярод славянскіх Вікіпедый [3]. Унікальнасць праекта заключаецца і ў тым, што “навукоўцам” можа стаць кожны. Сучаснае грамадства ў апошні час справядліва называюць спажыўцамі. Вікіпедыя дае магчымасць не толькі ўзяць што-небудзь з інтэрнэту, але і даць – абсалютна кожны можа дапоўніць гэтую энцыклапедыю.

Для аўтара артыкула гэта не проста словы. Ужо 7 гадоў ён з'яўляецца актыўным карыстальнікам Вікіпедыі, які за гэты час напісаў больш за 3 тысячы артыкулаў, у тым ліку і артыкул пра гістарычны факультэт БДПУ. На мой погляд, гэта выдатны старт для будучых навукоўцаў, для будучых настаўнікаў.

Дзякуючы такім рэсурсам, студэнт або вучань можа не толькі вучыцца працаваць з матэрыялам, з навуковымі крыніцамі, але выпрацоўваць навыкі збору, апрацоўкі, лагічнага выкладання і афармлення інфармацыі [4]. Калі карыстальнік пачынае пісаць новы артыкул, ён даследуе розныя крыніцы, тым самым пашыраючы свае веды, адкрываючы для сябе цікавую яму тэму ці праблему з іншага боку. У час напісання артыкула чалавек вучыцца вылучаць галоўнае, падаваць інфармацыю

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

аб’ектыўна. Самае галоўнае пры гэтым – жаданне дапоўніць свет тым, пра што яшчэ не напісана.

Першы аўтарскі артыкул быў пра родную вуліцу. У матэрыяле аказалася шмат недакладнасцей, але ў Вікіпедыі ёсць даглядчыкі, якія сочаць, за тым, каб прадстаўленыя звесткі былі правільнымі, адпавядалі рэчаіснасці. Калі пачынаць з малога, працаваць над памылкамі і пісаць усё больш складаныя артыкулы, то пачынаеш разумець, што Вікіпедыя гэта не толькі энцыклапедыя, але і добрая школа – зусім іншага, невядомага яшчэ нам фармату, дзе чалавек вучыцца сам, даследуючы цікавую для яго тэму. Гэта можа быць артыкул пра родную ВНУ, пра матэматычны закон або гістарычнага дзеяча... Менавіта такім шляхам больш за 200 энтузіястаў на працягу 15 гадоў стварылі самую вялікую ў гісторыі энцыклапедыю на беларускай мове – Беларускую Вікіпедыю.

## Літаратура


1. Беларуская Савецкая Энцыклапедыя [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Беларуская_Савецкая_Энцыклапедыя. – Дата доступу: 21.02.2019.
2. Беларуская Вікіпедыя [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Беларуская_Вікіпедыя. – Дата доступу: 21.02.2019.
3. List of Wikipedias [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://meta.wikimedia.org/wiki/List_of_Wikipedias. – Дата доступу: 21.02.2019.
4. Вікіпедыя : спіс правіл і рэкамендацый [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki/Вікіпедыя:Спіс_правіл_і_рэкамендацый. – Дата доступу: 21.02.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ